**Ю.М. Бабіч** (Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава)

## ПАЛАНІЗМЫ Ў СУЧАСНЫМ БЕЛАРУСКІМ МЕДЫЯДЫСКУРСЕ

На пачатку XXI стагоддзя ў беларускай мове істотна пашырылася колькасць пазычанняў з польскай мовы, якія сталі дастаткова часта фіксавацца і на старонках перыядычнага друку. Менавіта ў газетным радку новае слова праходзіць своеасаблівы этап сацыялізацыі, гэта значыць, рэцыпіенты найчасцей знаёмяцца з неалагізмам менавіта ў медыях, а ўжо потым пачынаюць самі яго выкарыстоўваць.

Ужыванне наватвораў у друку мае свае дастаткова акрэсленыя мэты. Падобныя лексемы надаюць напісанаму пэўную долю экспрэсіі, часам нават маляўнічасці, якая рэалізуецца ў стылявым "эфекце навізны". Імкненне да пошуку новых лексічных рэсурсаў, зусім незнаёмых ці малазнаёмых пакуль чытачу, у значнай ступені сведчыць пра крэатыўны падыход аўтараў да сродкаў моўнага выражэння. Такое адметнае словаўжыванне часта нівелюе магчымы афіцыёз і набліжае чытача да журналіста. Безумоўна, запазычванне – натуральны складнік працэсу функцыянавання і гістарычнага змянення мовы. Гэта таксама адна з галоўных крыніц папаўнення слоўнікавага запасу. Традыцыйна пазычаная лексіка адлюстроўвае асаблівасці міжэтнічных кантактаў, спецыфіку грамадска-эканамічных і культурных сувязяў паміж народамі. І калі тая ці іншая новая лексема рэгулярна на працягу пэўнага часу выкарыстоўваецца ў вусным маўленні, у публіцыстычным дыскурсе, гэта дае падставы трактаваць яе як фактычны кампанент мовы-рэцыпіента.

Цяпер у беларускай мове ўжываюцца дзясяткі неалагізмаў, пазычаных перадусім з англійскай мовы, якія адлюстроўваюць навацыі ў сферы навукі, тэхнікі, культуры. Зразумела, новых паланізмаў значна менш, але ў плане характарыстыкі грамадска-эканамічных ці культурных кантактаў яны ўяўляюць сабой надзвычай каштоўны матэрыял, будучы часта праз сваю навізну больш вобразнымі і яскравымі на фоне традыцыйных сінанімічных беларускіх лексем. І гэты фактар сам па сабе прываблівае рэцыпіента, павышае цікавасць да напісанага. Бо ў падобнай сітуацыі перад журналістам, як слушна заўважае Я. Клюеў, стаіць задача "даказаць, што ён сапраўды не дарэмна валодае правам ініцыяцыі моўнага ўзаемадзеяння, г. зн. што ён добра ўяўляе сабе, якім чынам адпаведны камунікацыйны акт павінен развівацца" [1; 39].

У сучасным публіцыстычным дыскурсе трывала замацавалася даволі значная група паланізмаў. Характэрна, што многія падобныя лексемы рэгулярна выкарыстоўваюцца на старонках самых розных выданняў, што дае, на наш погляд, досыць аб'ектыўную карціну прысутнасці адпаведнай лексемы ў беларускім лексіконе. Напрыклад, назоўнік *стасункі* (польск. *stosunek*), які цяпер ужываецца не радзей за слова *адносіны*: *Калісьці на нашай зямлі побач з людзьмі жылі Богі. Яны мелі паміж сабой розныя* ***стасункі*** (Віцебскі кур'ер, 28.10.10); *Мы вернікі, ходзім у касцёл, там таксама ёсць магчымасць* ***стасункаў*** (Чырвоная змена, 10.11.10); *Калі дарослы чалавек на працягу доўгага часу ні з кім не мае* ***стасункаў****, то паступова ў яго могуць парушацца вымаўленчыя здольнасці, памяншацца слоўнікавы запас* (Народная воля, 25-28.02.11); *Пакрысе абжываліся на новым месцы, абзаводзіліся сябрамі, наладзіліся* ***стасункі*** *з калегамі па рабоце* (Веснік Глыбоччыны, 23.04.11); *А цяпер раскажу пра свае* ***стасункі*** *з сучасным гандлем на працягу тыдня* (Свободные новости плюс, 3.08.11); ***Стасункамі*** *з дачкой бацька абсалютна задаволены* (Звязда, 29.07.11); *Напэўна, няблага мець цесныя сяброўскія* ***стасункі*** *з паэтамі…* (Прессбол, 13.01.12); *Пра шырокую геаграфію* ***стасункаў*** *паэта сведчаць яго ўспаміны…Дакументы пац-*



Репозиторий ВГУ

*вярджаюць шырокія міжнародныя* ***стасункі*** *заходнебеларускага руху…* (Роднае слова, 2013, №1, с.15). Паказальна, што дадзены назоўнік фіксуецца і ў рускамоўных выданнях, якія толькі зрэдку друкуюць матэрыялы па-беларуску ("Свободные новости плюс", "Прессбол").

Таксама істотна пашырылася сфера выкарыстання назоўніка *страйк* (польск. *strajk*, ад ням.*Streik*) – *забастоўка*: *Усеагульны беларускі* ***страйк****…* (Новы час, 28.01.11); *Нямецкія чыгуначнікі пачалі 60-гадзінны* ***страйк*** (Звязда, 19.04.11); ***Страйк*** *супрацоўнікаў "Мотавела"* (Наша ніва, 26.10.11). Найчасцей гэтае слова фіксуецца на старонках газеты "Звязда", прычым нярэдка ўваходзіць у склад загалоўка, што само па сабе падкрэслівае асаблівы семантычна-прагматычны аспект лексемы: *Грэчаскі* ***страйк*** *перарос у бунт* (30.06.11); *Еўропу ліхаманіць:* ***страйкі*** *і студэнцкія пагромы* (9.11.11); *У выніку* ***страйку*** *пацярпелі шматлікія замежныя турысты* (17.06.11). З пункту гледжання прагматыкі, у падобных выпадках на першы план выходзіць рэкламная функцыя, якая, паводле меркавання расійскай даследчыцы В. Багданавай, "з'яўляецца спецыфічнай для газетных загалоўкаў, паколькі задача загалоўка не толькі інфармаваць чытача, але і выклікаць цікавасць да зместу матэрыялу. Рэкламная функцыя стварае перадумовы для ўзнікнення эфекту ўзмоцненага чакання" [2;141].

Трэба сказаць, што побач з назоўнікам *страйк* у медыях прадуктыўна ўжываюцца вытворныя *страйковец*, *страйкамавец*, а таксама дзеяслоў *страйкаваць* і прыметнік *страйкавы*, што адлюстроўвае трывалыя пазіцыі згаданых лексем у сучасным беларускім дыскурсе: ***Страйкоўцы*** *патрабуюць увядзення адзінай тарыфнай дамовы…* (Звязда, 19.04.11); ***Страйкамаўцы*** *атрымалі пісьмовы адказ ад адміністрацыі…* (Наша ніва, 25.01.12); *Аўтар ліста падкрэсліў, што кіроўцы не могуць* ***страйкаваць*** (Наша ніва, 23.11.11); *Употайкі арганізуюцца* ***страйкавыя*** *камітэты* (Новы час, 28.01.11). Тут важна яшчэ заўважыць, што паралельнае функцыянаванне ў беларускай мове лексем *страйк* і *забастоўка* істотна ўзбагачае сінанімічны патэнцыял, дазваляе пазбегнуць шмат у якіх выпадках таўталогіі: ***Страйк*** *службаў бяспекі паралізаваў працу буйных аэрапортаў Германіі* (Загаловак). *Больш за 200 авіярэйсаў адменены ў Германіі ў сувязі з* ***забастоўкай*** *работнікаў службы бяспекі ў аэрапортах…* (Звязда, 15.02.13); *У Эстоніі настаўнікі праводзяць* ***страйк*** (Загаловак*)… Падчас* ***забастоўкі*** *настаўнікаў на вуліцы і плошчы гарадоў выйдуць больш за 15 тыс. чалавек* (Звязда, 6.03.12); *Супрацоўнікі папяровых камбінатаў перадумалі ісці на* ***забастоўку*** *салідарнасці. Прафсаюзы дамовіліся з працадаўцамі літаральна за пяць з паловай гадзін да афіцыйнага аб'яўлення* ***страйку*** (Звязда, 17.04.12). У прыведзеных фрагментах назоўнікі *забастоўка* і *страйк* успрымаюцца як абсалютна сінанімічныя. Гэта тая прымета, – сцвярджае А. Фёдараў, – якая дазваляе гаварыць "пра так званую нейтралізацыю слоў-сінонімаў, г.зн. пра сціранне семантычных адрозненняў паміж імі, пра магчымасць амаль поўнай іх узаемазамяняльнасці" [3; 9], што, у сваю чаргу, пэўным чынам уплывае на стылістычную адметнасць тэксту і сінтагматычны складнік.

У асобных выпадках пад уплывам польскай мовы актывізуецца выкарыстанне раней нізкачастотных лексем, якія цяпер дапаўняюць сінанімічны рад кадыфікаваных беларускіх слоў. Так, побач з шырокаўжывальнымі прыметнікамі *вядомы*, *знакаміты*, *славуты* ў айчынных медыях усё часцей фіксуюцца лексічныя адзінкі *выбітны* (пол. *wybitny*), *знаны* (пол. *znany*), *слынны* (пол.*sławny*). Прычым – зноў жа гэта падкрэслім – названыя лексемы намі адзначаны на старонках розных выданняў, што сведчыць пра іх дастатковую ўжо распаўсюджанасць у беларускай мове: *Памятны знак на месцы будучага помніка* ***выбітнаму*** *беларускаму пісьменніку* (Караткевічу.- Ю.Б.) *быў усталяваны яшчэ каля года таму…* (Віцебскі праспект, 30.09.10); *Сцэнарый уяўляе мастацкае дас-*



Репозиторий ВГУ

*ледаванне творчага і жыццёвага шляху* ***выбітнага*** *дзеяча беларускай культуры XVI стагоддзя* (Новы час, 28.01.11); *Васіль Сёмуха – адзін з самых* ***выбітных*** *беларускіх перакладчыкаў…* (Звязда, 20.01.11); *Імпрэза ладзілася ў межах міжнароднага праекту "Чэслаў Мілаш у Беларусі", прысвечанага стогадоваму юбілею* ***выбітнага*** *польскага паэта і эсэіста* (Віцебскі кур'ер, 8.09.11); *Віталь Скалабан – адзін з* ***выбітных*** *беларускіх архівістаў…* (ЛіМ, 30.09.11); *У Вільні героі іншыя –* ***знаны*** *літовец Костас Калінаўскас,* ***выбітная*** *літоўка Барбара Радвілайтэ … і Адомас Міцкявічус адпаведна* (Звязда, 3.12.10); *Юбілей* ***знанага*** *краязнаўца Гарадзеншчыны* (Наша слова, 26.01.11); *Госць з Гродна –* ***знаны*** *творца Юрый Якавенка выклікаў у віцяблян шчырую цікавасць* (ЛіМ, 1.04.11); *Зборнік склалі інтэрв'ю з нашымі* ***слыннымі*** *суайчыннікамі – жанчынамі, вядомымі ў Беларусі і за яе межамі* (Наша слова, 20.10.10); ***Слынны*** *даследчык энергіі Сонца Аляксандр Чыжэўскі – з Гродзенскай вобласці* (Звязда, 3.12.10). Сярод іншых дастаткова частотных сёння ў беларускім дыскурсе паланізмаў адзначым словы *валіза* (пол. *waliza*) – *чамадан*; *замовіць* (пол. *zamówić*) – *заказаць*; *каляжанка* (пол. *koleżanka*) – *калега-жанчына*, *сяброўка*; *пастарунак* (пол. *posterunek*) – *пост*, *участак*; *танчыць* (пол. *tańczyć*) – *танцаваць* ды некаторыя яшчэ. Можна меркаваць, што мы назіраем працэс паступовага асімілявання пазычаных з польскай ці праз польскую мову слоў. Досыць часта чалавек і не здагадваецца пра іншамоўнае паходжанне той ці іншай лексемы, бо яна арганічна ўпісваецца ў роднамоўны кантэкст.

З іншага боку, у мове медыяў часам адзначаюцца выпадкі бяздумнага, штучнага калькавання асобных лексем, калі без ніякай патрэбы пэўнае польскае слова ўводзіцца ў беларускі тэкст. У прыватнасці, пашырылася выкарыстанне ў друку прыметніка *выкшталцоны* (пол. *wykształcony*) – *адукаваны*. Асабліва ў "Нашай Ніве": *Падробленыя паганскія скульптуры былі надта ўжо* ***выкшталцоныя****…* (17.08.11*); Гэта не самая* ***выкшталцоная*** *кавярня, яе трымаюць простыя пацаны* (14.11.12). І тут мусім пагадзіцца з выказваннем беларускага мастака і грамадскага дзеяча Алега Аблажэя, які заўважыў: "Асабліва камічна, калі нават інтэлектуалы ўжываюць слова "выкшталцоны" ў сэнсе "изящный", – (выкшталцоныя ногі). Між тым "wykształcony" значыць "адукаваны". "Адукаваныя ногі" – праўда, няслаба, – працягвае ён. – І цягнуць, і цягнуць "пальшчызну" ў нашу мову" [4;8].

Такім чынам, прааналізаваны матэрыял дазваляе меркаваць, што ў сённяшніх беларускамоўных медыях ужываецца значная колькасць паланізмаў, многія з якіх паспяхова асвойваюцца мовай, па сутнасці асімілююцца. Падобныя словы, як правіла, абазначаюць камунікацыйна важныя паняцці, таму адразу трапляюць у сферу сацыяльнай увагі. Гэта падкрэслівае імкненне аўтараў узбагаціць нашу мову сінонімамі, дазваляе ў многіх выпадках пазбегнуць таўталогіі, што, урэшце, павінна спрыяць павышэнню культуры маўлення. Пры гэтым неабходна карпатліва ставіцца да выбару слова, усебакова ацэньваючы яго мэтазгоднасць для нашай мовы і не захапляючыся штучным калькаваннем.

## Літаратура


1. Клюев, Е.В. Речевая коммуникация. Учебное пособие для университетов и институтов / Е.В. Клюев. – М., 1998.
2. Богданова, О.Ю. Сопоставление функциональных особенностей заглавий художественных произведений и современной публицистики (на англоязычном материале) / О.Ю. Богданова // Ярославский педагогический вестник – 2012 – № 3 – Том I (Гуманитарные науки) .
3. Федоров, А.В. Основы общей теории перевода / А.В. Федоров, М.: ВШ. –1996).
4. Аблажэй, А. "Прышпільная" мова / А. Аблажэй // Беларус. –2013.– № 599 (травень).


Репозиторий ВГУ